**Пагарэлаў, А.** Ішлі ў бой партызаны / А. Пагарэлаў // Ленінская праўда (Віцебск). – 1988. – 13 жн. – С. 2–3.

## ІШЛІ Ў БОЙ ПАРТЫЗАНЫ

Наша рэспубліка і Кампартыя Беларусі ідуць да свайго слаўнага 70-годдзя. Адной з яркіх гераічных старонак яе гісторыі з'яўляецца ўсенародная барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У схватцы з фашызмам гарачы савецкі патрыятызм праявілі партызаны. Аб адной старонцы гэтай барацьбы на Віцебшчыне хочацца расказаць.

У гэтыя дні партызаны Першай Беларускай партызанскай брыгады адзначаюць 45-годдзе кровапралітнага, але пераможнага бою з нямецка-фашысцкімі карнікамі ў буеўскім лесе.

У нашым атрадзе, які ўваходзіў у састаў Першай Беларускай партызанскай брыгады і дыслацыраваўся на левым беразе Заходняй Дзвіны ў вузкай паласе лесу ад Рубы да вёскі Рыбакі, у асноўным былі мясцовыя людзі. Начальнікам разведкі і намеснікам камандзіра атрада з'яўляўся Рыгор Цімафеевіч Сальчанка з вёскі Клішава, начальнікам штаба – Пётр Людвігавіч Камароўскі з вёскі Буева, памочнікам начальніка штаба – Мікалай Палудзеткін з в. Палудзеткі, намеснікам камісара атрада па камсамолу – Сямён Васільевіч Юпатаў з в. Андронавічы, начальнікам агентурнай разведкі атрада – Вера Сямёнаўна Кулагіна з в. Букаціна, камандзірам узвода разведкі – Даніла Прусаў з в. Клішава, Радзіён Васільевіч Сухараў з пасёлка Руба, Міхаіл Магучы з в. Прысушына, Алег Шляхто з Буева, начальнінам боехарчавання атрада – Аляксей Лабоўкін з Ботаніцкага сельсавета, камандзірам разведвальна-дыверсійнай групы – Іван Андрэевіч Бекішаў з Віцебска і іншыя партызаны з навакольных вёсак Жалезнякі, Максюткі, Курына, Кошалева, Пышнякі, Бялынавічы, Бабінічы, Рыбакі, Жабенцяі, г. п. Суража і іншых населеных пунктаў.

11 жніўня вярхоўнае камандаванне Германіі выдала загад аб неадкладным будаўніцтве «Усходняга вала» – стратэгічнага абароннага рубяжу, які праходзіў на ўсход ад Віцебска, праз тэрыторыю нашай дыслакацыі. Праціўнік трымаў гэта будаўніцтва ў строгім сакрэце.

Да гэтага часу наш атрад ужо быў моцнай баявой адзінкай, правёўшай некалькі жорсткіх баёў у перыяд буйных нямецкіх карных экспедыцый, а таксама ў засадах і пры нападзенні на гарнізоны акупантаў.

Дзве нашы групы падрыўнікоў пад кіраўніцтвам камандзіра знішчальнага ўзвода Пятра Антоненкі і намесніка палітрука роты Пятра Анішчанкі, удзельнічаючы ў «рэльсавай вайне», у першай палавіне жніўня на чыгунцы Віцебск – Лёзна падарвалі больш трохсот рэльсаў. На дарогах, якія вядуць на фронт, на нашых мінах падрываліся танкі і іншая варожая тэхніка. Не давалі спакою гітлераўцам мы і ў іх гарнізонах. Наша разведвальная і дыверсійная групы, разам з падпольшчыкамі, пад кіраўніцтвам В. С. Кулагінай на Віцебскім аэрадроме падарвалі самалёт і воданапорную вежу, на чыгуначным вузле каля дэпо вывелі са строю толькі што адрамантаваны паравоз. Мы збіралі і перадавалі ў штаб брыгады каштоўныя разведданыя аб колькасці тэхнікі і войск ворага ў Віцебску, што давала магчымасць нашай авіяцыі наносіць прыцэльныя ўдары па акупантах.

У ноч з 17 на 18 жніўня 1943 года з прыфрантавога Войлаўскага аэрадрома Смаленскай вобласці на 15 самалётах У-2 двума рэйсамі на наш партызанскі аэрадром, непадалёку ад Курына быў перакінуты дэсант у колькасці больш 50 добра ўзброеных байцоў пад камандаваннем

Аляксандра Сяргеевіча Пятрова. Штаб апергрупы Калінінскага фронта перад ім паставіў задачу: зрабіць рэйд у трохвугольнік шасейных і чыгуначных дарог Смаленск – Віцебск – Орша.

Нямецкае камандаванне ведала аб дыслакацыі партызан і імкнулася знішчыць нас. Асабліва пачасціліся і павялічыліся нападзенні гітлераўцаў у ліпені і жніўні, калі праціўнік кідаў на нашу зону да 600 салдат і афіцэраў, заходзіў у лес, займаў вёскі і ўганяў непаспеўшых абараніцца. 13 жніўня карнікі занялі правы бераг Дзвіны на працягу 20 кіламетраў, якраз насупраць размяшчэння нашага атрада, каб мы не змаглі пераправіцца на процілеглы бераг у вялікія лясы, у партызанскую зону.

Адчувалася, што гітлераўцы бяруцца за нас не на жарт. Мы паставілі больш пастоў, узмацнілі баявую ахову. У нашай вузкай паласе лесу, працягласцю каля 40 кіламетраў было ўсяго два невялікіх атрады: наш і М. П. Машкова. Праўда, сіл прыбавілася пасля прыбыцця дэсанту Пятрова і двух рот. Адна, на чале з Іванам Рыгоравічам Салаўёвым з атрада Курмялёва і адна з атрада Гурко пад камандаваннем Аляксандра Дзямідавіча Махлакова. Усяго ў нас налічвалася каля 400 чалавек.

Наступленне фашысты пачалі ў ноч з 23 на 24 жніўня. К дзевяці гадзінам, калі рассеяўся туман, высветлілася: фашысты акапаліся на правым беразе Дзвіны. Каля дарогі паміж шашой Віцебск – Сураж і лесам устанаўлівалася артылерыя, мінамёты, хадзілі танкі. Яны ўваходзілі ў лес з-пад Віцебска і Суража. Становішча атрада станавілася вельмі складаным і небяспечным. Супраць нас былі кінуты ў некалькі разоў пераўзыходзячыя сілы ворага. Выйсці з такога смяротнага акружэння мы маглі толькі сваімі сіламі, уменнем весці бой у лесе, дзе партызанам былі вядомы ўсе сцяжынкі. Камандзіры і палітработнікі растлумачылі партызанам абстаноўку. У людзей адчуваўся баявы настрой. Распрацавалі план бою. На небяспечных узлесках, на дарогах зрабілі засады, дзе-нідзе паставілі міны.

На буеўскіх могілках засадай кіраваў Сальчанка. Пад яго камандаваннем знаходзілася каля роты і, калі гітлераўцы шчыльнай масай падышлі да могілак, дзе стаяла абсалютная цішыня і ні адзін кусцік не зварухнуўся, раптам па ворагу быў адкрыты знішчаючы агонь. Немцы разгубіліся, пабеглі назад, пакінуўшы на адкрытым полі больш 30 трупаў. Праз некаторы час яны адкрылі па могілках з буйнакаліберных і станкавых кулямётаў агонь. Але там партызан ужо не было. У лес карнікі ўвайшлі толькі праз дзве гадзіны. Мы адыходзілі ў раён Яшкоўскага возера за Рыбакамі, дзе лес быў большы, можна было лепш манеўраваць.

У сярэдзіне дня, непадалёку ад дарог Белікі – Рыбакі сустрэлі атрад Машкова і пятроўцаў. Яны адыходзілі з баямі з-пад Суража. Параіліся, рашылі арганізаваць кругавую абарону – адкуль карнікі падыйдуць першымі, туды і прарывацца. Калі на Віцебск, то ў Аўдзееўскую пушчу – буйны масіў лесу паміж Буевым і Рубай. Для абароны ў бок Віцебска выбралі добрую пазіцыю: праз лес ішла вузкая дарога і асушальная канава, у яе і залеглі асноўныя сілы партызан.

Праз некаторы час з Белікаў на Рыбакі прайшла вялікая калона немцаў. Яны пачалі акопвацца байніцамі ў наш бок. Стала ясна, што варожы ланцуг, які ідзе з-пад Буева, павінен выцесніць нас на гэту засаду гітлераўцаў.

Гадзіннік паказаў 17. Мы выйгралі час, хутка вечар, а ноч – наша саюзніца. Калі гітлераўцы шчыльным ланцугом, упершыся ў жывот аўтаматамі, выйшлі на ўзлесак і аказаліся літаральна ў некалькіх кроках ад нас, прагучалі каманды і раздаўся залп. Партызаны з крыкамі «ура!» кінуліся наперад. Першы ланцуг быў змяты. У гэтай атацы ў нас раніла ў нагу новага камандзіра ўзвода разведкі Сяргея Палудзеткіна, які замяніў Д. П. Прусава, адпраўленага пасля ранення за лінію фронта.

Мы ішлі назад да буеўскіх могілак, каб прарвацца ў Аўдзееўскую пушчу. Прарвалі яшчэ тры ланцугі. Бой у лесе даходзіў да рукапашных схватак. Іншы раз наша атака спынялася, праціўнік падкідваў новыя сілы. У такія моманты камандзіры рот нашага атрада І. Н. Яршоў, Дзмітрый Якунін, Іван Салаўёў, палітрукі рот, камуністы Н. І. Хлоба, С. І. Івашнеў, І. П. Цуранаў, камісар атрада Машкова, Т. Е. Керасёў, яго намеснік па камсамолу Канстанцін Шабанаў, начальнік разведкі Міхаіл Купчанка, камісар дэсанта Н. П. Сенакосаў вялі за сабой партызан на ворага. Асабліва адважна і ўмела ішоў наперадзе разведчыкаў Рыгор Сальчанка. Часта наша стральба па карніках вялася ва ўпор.

Пяць кіламетраў бесперапыннага бою да Аўдзееўскай пушчы партызаны пераадолелі за тры гадзіны. Выйсці з такога вогненнага кальца мы змаглі, дзякуючы масавай адвазе, згуртаванасці, узаемнай выручцы і падрабязнага ведання лесу і прылягаючай мясцовасці. Артылерыя ворага нас не абстрэльвала. Карнікі не ведалі, дзе свае, а дзе партызаны. У самых гарачых кропках бою геройскі загінулі намеснік камандзіра атрада камуніст, танкіст старшы лейтэнант Рыгор Цімафеевіч Сальчанка, камандзір роты камуніст Іван Рыгоравіч Салаўёў, падарвалі сябе гранатамі разам з падышоўшымі карнікамі, смяротна раненыя, намеснік камісара атрада Канстанцін Андрэевіч Шабанаў, камісар дэсанта Мікалай Пятровіч Сенакосаў і камандзір падраздзялення дэсанта Ілля Рыгоравіч Капейка. Яны падарваліся адной гранатай. Іх далей партызаны ўжо не маглі несці, праціўнік абстрэльваў з тылу. Два партызаны, якія ахоўвалі раненых, загінулі. Усяго ў гэтым баі загінула 28 партызан, а праціўнік страціў у некалькі разоў больш.

Камсамольцы Міхаіл Магучы і Іван Варапаец вынеслі з такога бою цяжка параненага свайго баявога сябра Леаніда Кавалеўскага. Большасць загінуўшых партызан мы пахавалі ў брацкіх могілках каля буеўскіх могілак. Мы пакляліся адпомсціць фашыстам за іх смерць. Партызаны, якія цяпер жывуць, часта ўспамінаюць, што засталіся яны ў жывых у многім дзякуючы гераічнаму подзвігу загінуўшых баявых сяброў, пралітай на гэтай зямлі імі сваёй крыві.

Карнікі, панёсшы вялікія страты, не выканаўшы пастаўленай задачы, са звярынай злосцю помсцілі, уганялі з гэтых месц у канцлагеры амаль усё насельніцтва, у тым ліку і малалетніх дзяцей. З Буева ў іх лапы трапілі сямігадовая Тамара Зайцава, дзесяцігадовы Коля Якаўлеў, яго сястра Вера, з Максютак Ліда Хадарышчанка і многія іншыя. Ім усім у Асвенцыме на руках накалолі нумары, а грудной Тамары Сухаравай – на ножцы.

У навакольных вёсках было паўторна спалена прыстасаванае жыллё, разварочаны зямлянкі. Мясцовасць апусцела, яе канчаткова апаліла вайна. Але пасля вяртання партызан на ранейшыя месцы дыслакацыі, з лесу, балот з'явіліся рэдкія жыхары, якія цудам выратаваліся ад карнікаў і ўліліся ў атрад. У верасні прынялі прысягу партызана 24 байцы, у кастрычніку – 18.

За верасень і кастрычнік знішчана 275 захопнікаў, падарвалі 25 варожых аўтамашын і 3 масты, 13 акупантаў захапілі ў палон. Многія партызаны былі прадстаўлены і ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. Найбольш адданыя, паказаўшыя геройства і ўменне кіраваць боем, былі прыняты ў партыю і камсамол.

Нам, ветэранам Айчыннай вайны вельмі прыемна, што Віцебскі райком партыі і райвыканком удзяляюць вялікую ўвагу ўвекавечванню памяці загінуўшых партызан, клапоцяцца аб нас. Мы ўдзячны камсамольцам Віцебскага ветэрынарнага інстытута, падтрыманых абкомам камсамола, якія з дапамогай калгаса «Памяць Леніна», будтрэста № 28, выканкома Бабініцкага сельсавета, абласнога штаба студэнцкага будаўнічага атрада імя М. П. Шмырова і шэрагу іншых будаўнічых

арганізацый і грамадскасці метадам народнай будоўлі, на брацкай партызанскай магіле ля Буева збудавалі помнік загінуўшым 24 жніўня 1943 года партызанам I Беларускай брыгады.

Мы таксама ўдзячны насельніцтву калгаса «Памяць Леніна», эксперыментальнай базы імя М. П. Шмырова, Бабініцкага, Задуброўскага, Суражскага, Курынскага Саветаў народных дэпутатаў за тое, што яны шануюць памяць загінуўшых партызан. Вялікую работу па ўвекавечванню памяці загінуўшых пра-водзяць Запольская, Суражская, Рубаўская, Ботаніцкая, Бабініцкая, Курынская школы, СШ № 17 і 27, ТВ-37 імя Шмырова г. Віцебска.

**А. ПАГАРЭЛАЎ,**

**былы камандзір партызанскага атрада**